няй мінуўшчыны. Ініцыятар і старшыня Усебел. фестывалю нар. гумару ў Аўцюках Калінкавіцкага раёна, які з 1995 стаў традыцыйным. Выдаў кнігу «Аўцюкоўцы» (1995) — збор нар. анекдотаў, жартаў, дасціпных нар. апавяданняў пра землякоў з вёсак Вялікія і Малыя Аўцюкі.

*С. М. Шчэрба.*

**ЛІ́ПЧЫК** Міхаіл Яўстаф'евіч (н. 7.5. 1959, г. Глыбокае), баяніст. Заслужаны артыст Беларусі (1989). Скончыў Наваполацкае музычнае вучылішча (1974), Бел. кансерваторыю (1982). З 1980 працаваў у Дзяржаўным акадэмічным нар. аркестры Беларусі імя І.Жыновіча, у Дзяржаўным акадэмічным нар. хоры Беларусі імя Г.Цітовіча, з 1993 у ансамблі нар. музыкі «Свята», з 1995 у ансамблі нар. музыкі «Вяселле», з 1997 у Дзяржаўным ансамблі танца Беларусі. Яго выкананню ўласціва тонкае адчуванне стылю нар. музыкі, імправізацыйнасць, высокая тэхніка валодання баянам і гармонікам. У рэпертуары бел. нар. песні і танцы: «Кума мая, кумачка», «Быў бы ў мяне сівы конь», «Пасею гурочкі», «Вянок» бел. нар. песень у апрацоўцы М.Сіраты, «Віцебская кадрыль», гармонікавыя найгрышы ў апрацоўцы В.Людчыка і інш. Лаўрэат фестывалю нар. музыкі ў Італіі (1990), Францыі (1995), Паўднёвай Карэі (1997), Іспаніі (1998).

*Н. Г. Мазурына.*

**ЛІ́РА КО́ЛАВАЯ**, струнны музычны інструмент, фрыкцыйны *хардафон*. Нязменны спадарожнік прафесійных старцаў-жабракоў, якія з яе дапамогай зараблялі на пражытак. Мае назвы лера, рэля, рыля, старэцкая скрыпка (Чэрвеньшчына), бандура, кобза (бел.-украінскае памежжа). Інструмент мае драўляны корпус розных форм: прамавугольнай з закругленымі вугламі, авальнай з крыху пазначанай «таліяй» (як у віёлы), фігурнай (са скрыпічным ці гітарным профілем). Найчасцей абедзве дэкі Л. к. — верхняя («грудзявая») і ніжняя («плечавая») — плоскія, прычым у верхняй дэцы зроблены рэзанатарныя адтуліны ў выглядзе кружкоў, скобак або эфаў. Да верхняй часткі корпуса мацуецца каробка («корх»), да верху ці бока якой прыстасаваны калкі-«закруткі» для нацягвання струн. Унутры ніжняй часткі корпуса ўмацавана драўлянае кола, якое выконвае ролю бясконцага смыка. Кола, якое



*Ліпніцкі народны фальклорна-этнаграфічны гурт «Скібічане».*

сваёй невялікай часткай выступае праз прарэз верхняй дэкі, насаджана на вось, прасунутую скрозь абячайкі і прыводзіцца ў рух жалезнай ручкай («корбай»). Для захавання гладкасці вобада кола ад пашкоджання над ім устанаўліваюць дугападобны засцерагальнік з лубу, т. зв. мост. На верхняй дэцы, уздоўж яе прымацавана каробка з клавішамі-«палюхамі» («націскальнікамі»), што ўяўляюць сабой вузкія драўляныя планкі з перпендыкулярна ўстаноўленымі на канцах выступамі тапорыкападобнай формы. Клавішы пры націсканні на іх пальцамі датыкаюцца выступамі да сярэдняй меладычнай струны (струн) і змяняюць даўжыню яе гучальнай часткі. Колькасць клавішаў у бел. Л. к. вар'іруецца ад 4—5 да 13, што абумоўлівае розны аб'ём яе гукарада. Каробка з клавішамі, каб пазбегнуць яе пашкоджання, прыкрыта вечкам-«адтуліцай». Колькасць струн ад 2 да 4. З трох жыльных струн рознай таўшчыні адна (сярэдняя), праходзіць скрозь клавішную каробку і выходзіць праз спецыяльную адтуліну (у інструментаў з 4 струнамі дзве сярэднія). Сярэдняя струна (струны, «рымза») — меладычная; крайнія па-за каробкай па абодва яе бакі («гудавыя») — бурдонныя. Струны прымацоўваюцца адным канцом да калкоў, другім — да штыфтоў, паўбіваных у абячайку. Усе струны шчыльна прылягаюць да кола і пры трэнні аб яго пачынаюць гучаць. Л. к. мае строй, пры якім бурдонныя струны настройваюцца ў квінту і ў актаву ці квінту з меладычнай. Гучанне інструмента крыклівае, рэзкаватае, тужлівае, манатоннае, крыху гугнявае, цалкам адпавядаючае